Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА “Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
______________ Ю. П. Бондар
“_____” ___________2011 г.
Рэгістрацыйны № ВД- _____/вуч.

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ СВЯТОЧНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСАЎ

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01*
*Рэжысура свят (народныя)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2011

**Складальнікі:**

*П. А. Гуд*, загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат гістарычных навук, прафесар;

*А. Я. Камінскі*, старшы выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**Рэцэнзенты:**

*У. М. Шавялёў*, начальнік упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь;

*В. В. Калацэй*, загадчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат культуралогіі, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння**:

*кафедрай* рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў ” (пратакол № 4 ад 26.11.2010 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў ” (пратакол № 3 ад 14.12.2010 г.)

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *А. Я. Камінскі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна "Традыцыйная святочная культура беларусаў" з'яўляецца асноватворнай пры падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для галіны святочнай культуры. Вывучэнне абрадаў і свят каляндарнага цыкла, традыцыйнай і сучаснай гарадской святочнай культуры Беларусі, узаемадзеянне традыцый і навацый маюць практычную неабходнасць, з'яўляюцца актуальнымі і сацыяльна значнымі.

Працэс вывучэння традыцыйнай святочнай культуры вядзецца ў тэарэтычнай, метадычнай і практычнай сувязі з такімі дысцыплінамі, як "Гісторыя свят", "Рэжысура свят", "Мастацка-дэкаратыўнае вырашэнне свята", "Музычна-шумавое вырашэнне свята", "Пластычная культура". Назапашаныя веды па пералічаных спецыяльных дысцыплінах будуць садзейнічаць комплекснаму засваенню вучэбнага матэрыялу.

Праграма курса "Традыцыйная святочная культура беларусаў" мае на мэце вывучэнне беларускай святочнай культуры, яе этнічных спецыфічных рыс і рэгіянальных асаблівасцей, раскрыццё шляхоў удасканалення сучасных свят на аснове культурна-гістарычнай пераемнасці.

*Задачы* курса:

– знаёмства з духоўнай культурай і яе неад'емнай часткай – святамі і абрадамі;

– раскрыццё генетычнай асновы і тэндэнцый развіцця традыцыйных і сучасных свят;

– выяўленне працэсаў пераемнасці, зменлівасці і ўстойлівасці абраднасці беларусаў;

– вызначэнне прычын, якія перашкаджаюць распаўсюджванню прагрэсіўных народных традыцый, шляхоў павышэння выхаваўчага значэння свят і выпрацоўка рэкамендацый па выкарыстанні культурнай спадчыны мінулых пакаленняў у сучаснай святочнай культуры Беларусі;

– фарміраванне мастацкай свядомасці будучага спецыяліста – рэжысёра свят.

У выніку азнаямлення з курсам у поўным аб'ёме, згодна яго тэарэтыка-практычнай накіраванасці, студэнт павінен *ведаць:*

– змест рытуальна-абрадавых комплексаў і свят каляндарна-аграрнага цыкла;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– сімволіку грамадскага і сямейнага быту беларусаў, святочных і абрадавых страў каляндарнага цыкла і сямейна-бытавых абрадаў;

– гісторыю беларускай народнай кухні, традыцыі народнага застолля;

– прынцыпы арганізацыі і правядзення, сімвалічна-вобразнае вырашэнне паратэатральнага дзейства беларускай шляхты;

– трансфармацыю абрадава-рытуальных дзеянняў падчас правядзення сучасных дзяржаўных, міжнародных, прафесійных, рэлігійных і маладзёжных свят.

Адначасова з набыццём ведаў студэнт павінен *умець*:

– вызначаць класіфікацыю абрадаў і свят сучаснай святочнай культуры;

– вылучаць агульнанацыянальныя, рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці рытуальных комплексаў пэўнага свята каляндарнага цыкла;

– аналізаваць выкарыстанне сцэнарыстамі і рэжысёрамі ў масавых мерапрыемствах традыцыйных і навацыйных святочных формаў;

– распрацоўваць фальклорна-этнаграфічныя абрадава-рытуальныя дзеянні народных абрадаў і свят каляндарнага цыкла, сучасных святочных формаўтварэнняў.

Для больш глыбокага засваення матэрыялу, апрача аўдыторных заняткаў, у якасці самастойнай работы прадугледжваюцца наведванне студэнтамі музеяў, прагляд і аналіз відэаматэрыялаў выступленняў фальклорных калектываў, фестываляў народнай творчасці, сямейных абрадаў, этнаграфічныя назіранні і аналіз сучасных свят. Сярод актыўных тэхналогій работы са студэнтамі неабходна вылучыць:

– дыскусійныя метады (групавая дыскусія, мадэліраванне практычных сітуацый, метад кейсаў, аналіз сітуацый з практыкі і інш.);

– гульнявыя метады (імітацыйныя, дзелавыя, ролевыя гульні, “генерацыя ідэй” і інш.);

– сенсітыўны трэнінг (трэніроўка самапазнання, рэгуляванне эмацыянальных адносін да сябе і калег);

– візуальныя метады (метады ілюстрацыі, дэманстрацыі, відэаметад).

Курс згодна тэматычнай дыферэнцыяцыі падзелены на шэсць раздзелаў і разлічаны на вывучэнне шматпланавага вучэбнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыялу на працягу дзевяці навучальных семестраў падчас лекцыйных, семінарскіх, практычных, індывідуальных заняткаў і самастойнай работы. Вучэбная праграма дысцыпліны разлічана на 304 гадзіны, у тым ліку 150 аўдыторных. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін: 72 – лекцыйныя, 56 – практычныя, 18 – семінарскія, 4 – індывідуальныя заняткі.

Выніковымі формамі кантролю ведаў з'яўляюцца залікі і экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы, тэмы | Колькасць гадзін | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекц | практ зан. | сем | інд. зан. |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | | | |
| **Раздзел I. Беларускія народныя абрады і святы каляндарнага цыкла** | | | | | |
| *Тэма 1.*Свята зімовага сонцастаяння. Агульная характарыстыка | 8 | 4 | 2 | 2 | |
| *Тэма 2.* Каляднае ігрышча (варажба, гульні, забавы) | 4 | 2 | 2 | | |
| *Тэма 3.* Абрады завяршэння Каляд на вольным паветры | 4 | 2 | 2 | | |
| *Тэма 4.* Беларуская Масленіца | 6 | 2 | 2 | 2 | |
| *Тэма 5.* Святы летняга сонцастаяння. Тэрытарыяльная і рэгіянальная спецыфіка Купалля ў Беларусі | 10 | 4 | 4 | 2 | |
| *Тэма 6.* Культ сонца, раслін, вады, продкаў, іх сімволіка і семантыка | 7 | 2 | 2 | 2 | 1 |
| *Тэма 7.* Спас | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 8.* Структура, сімволіка і семантыка абрадаў зажынак, дажынак | 4 | 2 | 2 | | |
| *Тэма 9.* Святы завяршэння восеньскага календара беларусаў | 4 | 2 | 2 | | |
| *Тэма 10.* Беларускі кірмаш. Гандлёвыя і забаўляльна-гульнявыя дзеянні беларускага кірмашу | 6 | 4 | 2 | | |
| *Тэма 11.* Структура, сімволіка і семантыка абрадаў і свят сустрэчы вясны. Гульні, карагоды | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 12.* Вялікдзень у Беларусі | 6 | 2 | 2 | 2 | |
| *Тэма 13.* Сімволіка і семантыка Юр'я – свята выгану жывёлы ў поле | 4 | 2 | 2 | | |
| *Тэма 14.* Сёмуха. Русальны тыдзень | 4 | 2 | 2 | | |
| **Раздзел II. Грамадскі і сямейны быт беларусаў** | | | | | |
| *Тэма 15.* Беларускае вяселле | 4 | 2 | 2 | | |
| *Тэма 16.* Сямейная абраднасць. Народныя звычаі абраду радзін | 7 | 2 | 2 | 2 | 1 |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| *Тэма 17*. Грамадскія звычаі беларусаў | 6 | 2 | 2 | 2 | |
| *Тэма 18*. Пахавальна-памінальная абраднасць | 4 | 2 | 2 | | |
| **Раздзел III. Паратэатральная культура Беларусі XIV–XIX стст.** | | | | | |
| *Тэма 19*. Паратэатральнае дзейства беларускай шляхты | 7 | 2 | 2 | 2 | 1 |
| *Тэма 20*. Баявыя і спартыўныя адзінаборствы беларусаў | 4 | 2 | 2 | | |
| **Раздзел IV. Беларуская народная кухня** | | | | | |
| *Тэма 21*. Гісторыя беларускай народнай кухні | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 22*. Традыцыі народнага застолля. Этыкет паводзін за сталом | 4 | 2 | 2 | | |
| *Тэма 23*. Святочныя і абрадавыя стравы каляндарнага цыкла і сямейна-бытавых абрадаў | 6 | 2 | 2 | 2 | |
| **Раздзел V. Народныя традыцыі і навацыі ў сучасных беларускіх святах** | | | | | |
| *Тэма 24*.Традыцыі і навацыі ў сучасных зімовых святах | 4 | 2 | 2 | | |
| *Тэма 25*. Выкарыстанне народных традыцый у сучасных святах вясенне-летняга цыкла | 4 | 2 | 2 | | |
| *Тэма 27*. Традыцыйнае і новае ў сучасных восеньскіх святах | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 28*. Традыцыі і навацыі ў сучасных гарадскіх святах Беларусі | 4 | 2 | 2 | | |
| *Тэма 29*. Традыцыі і навацыі ў сямейна-бытавой абраднасці | 4 | 2 | 2 | | |
| **Раздзел VI.Сучасны святочны каляндар Беларусі** | | | | | |
| *Тэма 30*. Дзяржаўныя святы | 5 | 2 | 2 | | 1 |
| *Тэма 31*. Міжнародныя святы | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 32*. Прафесійныя святы | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 33*. Рэлігійныя святы | 4 | 2 | 2 | | |
| *Тэма 34*. Маладзёжныя і дзіцячыя святы | 2 | 2 | | | |
| **Разам…** | **150** | **72** | **56** | **18** | **4** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ КУРСА

## Уводзіны

Мэты і задачы дысцыпліны “Традыцыйная святочная культура беларусаў” і яе месца ў падрыхтоўцы рэжысёраў абрадаў і свят. Праблемы сучаснай святочнай культуры Беларусі. Паняцці “традыцыя”, “звычай”, “абрад”, “відовішча”, “прадстаўленне”, “свята”. Этапы станаўлення і развіцця беларускай святочнай культуры. Класіфікацыя свят і абрадаў. Аналіз дзейнасці культурна-асветніцкіх устаноў Беларусі ў сферы святочнай культуры.

## Раздзел I. Беларускія народныя абрады і святы каляндарнага цыкла

### *Тэма 1. Свята зімовага сонцастаяння. Агульная характарыстыка*

Свята зімовага сонцастаяння ў народаў Еўропы. Этымалогія слова “каляда”, генезіс і характэрныя рысы славянскага свята. Стадыяльныя пласты развіцця каляднай абраднасці беларусаў. Аграрная аснова каляднай абраднасці, сельскагаспадарчая і шлюбная магія. Хрысціянскія тэатралізаваныя дзеянні. Калядныя ігрышчы. Тэрытарыяльныя адрозненні калядных урачыстасцей.

### *Тэма 2. Каляднае ігрышча (варажба, гульні, забавы)*

Паходжанне ігрышча і яго трансфармацыя ад абрадавага да масава-гульнявога дзеяння. Тэрміны правядзення і структура ігрышчаў, узроставы склад удзельнікаў. Функцыі арганізатараў. Характэрныя рысы і тэрытарыяльныя адрозненні экспазіцыйнай часткі ігрышчаў (танцы, варажба).

Калядная варажба шлюбнай накіраванасці і яе класіфікацыя (магічная варажба і варажба-вытлумачэнне). Тэрміны правядзення і змест варажбы. Тэматыка, змест і тэрытарыяльныя адметнасці рознаварыянтнай варажбы шлюбнай накіраванасці. Змест і семантыка абрадавых гульняў, ігрышчаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 3. Абрады завяршэння Каляд на вольным паветры*

Структура, выразныя сродкі і адметныя асаблівасці збору калядных гуртоў вёсак на калектыўныя ігрышчы як форма завяршэння Каляд у закрытым памяшканні. Тэрытарыяльныя асаблівасці зместу, сімволіка і семантыка дзейства завяршэння Каляд на вольным паветры ў Мінскай вобласці. Адметныя асаблівасці калядных святкаванняў беларускай шляхты, тэатралізаваныя піры, танцы, феерверкі, варажба і гульні.

*Тэма 4. Беларуская Масленіца*

Агульнаеўрапейскі характар і традыцыйная аснова свята праводзін зімы. Генезіс свята і этымалогія слова "масленіца". Структура і тэрытарыяльныя адрозненні аграрных, сямейна-радавых абрадаў. Своеасаблівасць беларускіх масленічных забаў. Элементы карнавалізацыі і маскавання ў абрадзе "цяганне калодкі". Уплыў заходнееўрапейскай культуры на шляхецкія масленічныя традыцыі і забавы (карнавалы, маскарады, феерверкі, спектаклі).

*Тэма 5. Святы летняга сонцастаяння. Тэрытарыяльная і рэгіянальная спецыфіка Купалля ў Беларусі*

Свята летняга сонцастаяння ў народаў Еўропы як форма адлюстравання аграрна-жывёлагадоўчага і сонечнага культу. Этымалогія назвы "Купалле". Генезіс купальскіх звычаяў і абрадаў, іх агульнаславянскія рысы. Купальскія павер'і беларусаў, анімістычныя ўяўленні аб свяце. Функцыянальная накіраванасць культу сонца, раслін, вады і продкаў. Хрысціянская царква ў барацьбе з купальскай абраднасцю. Агонь як адлюстраванне сонечнага культу славян. Змест, вобразнасць, сімволіка і семантыка вогненнага дзейства Купалля.

Тэрытарыяльныя асаблівасці экспазіцыйнай часткі. Рэгіянальныя асаблівасці абрадавых вогненных гульняў. Апафеоз купальскага дзейства. Яго лакальная варыятыўнасць. Тэрытарыяльныя разнавіднасці завяршэння Купалля ў беларусаў.

Гульні моладзі каля вогнішча. Гульнявыя элементы ў карнавальным абходзе вёскі. Спецыфічныя гульнявыя дзеянні агульнанародных купальскіх кірмашоў. Адметныя гульні купальскіх кантрактавых кірмашоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 6. Культ сонца, раслін, вады, продкаў, іх сімволіка і семантыка*

Абрадава-магічныя дзеянні салярнага культу (развядзенне рытуальных агнёў, факельныя шэсці, абход палеткаў з палаючымі паходнямі, звычай сустрэчы ўзыходу сонейка). Сінкрэтычнае адзінства культу расліннасці з іншымі звычаямі (пусканне вянкоў па вадзе, перакідванне іх праз вогнішча, спальванне мая, паранне ў лазні з сабранымі зёлкамі, спальванне антрапаморфнай лялькі Марэны, кіданне ў ваду галавешак з вогнішча). Выяўленне магіі расліннасці, вады і агню ў рытуальна-абрадавай варажбе па вянках. Ачышчальныя і аздараўленчыя функцыі старажытных купальскіх абрадаў купання ў рэках і качання ў расе. Традыцыя карнавальнага пераапранання ў нябожчыкаў як магічны акт ачышчэння ад нячыстай сілы.

*Тэма 7. Спас*

Спас як свята грамадзянскага ўжывання пладоў новага ўраджаю. Звычаі свята і размеркаванне яго па тэрмінах: Першы Спас – Мядовы Спас, Другі Спас – Яблычны Спас, Трэці Спас – Палатняны Спас. Павер'е аб рабінавай ночы. Хрысціянскія напластаванні на структуру абраду.

*Тэма 8. Структура, сімволіка' і семантыка абрадаў зажынак і дажынак*

Агульнаславянскія элементы і нацыянальныя асаблівасці свята ўборкі хлеба. Павер'е аб заломах, абрад пакрывання поля. Структура, сімволіка і семантыка абраду зажынак. Дажынкі – стараславянская форма завяршэння жніва. Анімістычныя і хрысціянскія элементы земляробчых рытуалаў у полі. Структура пасляабрадавых дзеянняў і развіццё ў іх эстэтычных кампанентаў.

*Тэма 9. Святы завяршэння восеньскага календара беларусаў*

Звычаі, структура і семантыка рытуалаў восеньскага свята Багач (калектыўны збор экспанатаў зернавых культур, выраб лубка з зернем і свечкай, абходы хат, калектыўная вячэра). Пакровы як свята восеньскага цыкла. Аграрная аснова свята. Хрысціянскія наслаенні. Пакроўскія фэсты і кірмашы. Звычаі памінання. Дзяды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 10. Беларускі кірмаш. Гандлёвыя і забаўляльна-гульнявыя дзеянні беларускага кірмашу*

Генезіс кірмашу і этымалогія назвы. З'яўленне і распаўсюджванне кірмашу на тэрыторыі Беларусі. Спецыялізацыя гандлю: агульнагаспадарчыя, конскія, рыбныя, грыбныя, ягадныя кірмашы. Кантрактавыя кірмашы і лясныя кірмашы. Сфера абслугоўвання на кірмашах. Кірмашовы тэатр.

Гандаль як форма куплі-продажу. Рэклама тавару на беларускіх кірмашах. Змест, канструктыўныя асаблівасці і спосабы актывізацыі ўдзельнікаў у гандлёва-гульнявых атракцыёнах. Выстаўкі як дэманстрацыя дасягненняў гаспадаркі.

Мастацтва скамарохаў на кірмашах, дзейства ў фраі. Народныя забавы як сродак далучэння да ўдзелу ў кірмашы людзей розных узроставых катэгорый. Рэгіянальныя асаблівасці і змест народных забаў. Конкурсы хароў, ансамбляў і выканальнікаў прыпевак. Забаўляльныя гульні кантрактавых кірмашоў. Канцэрты інструментальнай музыкі. Спектаклі тэатраў і імпрэзы цыркаў. Летнія карнавалы.

*Тэма 11. Структура, сімволіка і семантыка абрадаў і свят сустрэчы вясны. Гульні, карагоды*

Веснавыя традыцыі і абрады ўсходніх славян. Генезіс, структура, функцыянальныя напрамкі і адметныя асаблівасці беларускіх свят сустрэчы вясны. Абрадавая ежа. Веснавыя гульні, карагоды.

*Тэма 12. Вялікдзень у Беларусі*

Хрысціянскія і свецкія напластаванні. Ачышчальная і прафілактычная магія абрадаў Вялікадня – славянскага свята абуджэння прыроды. Абрадавая ежа. Велікодныя хрысціянскія і свецкія забавы. Валачобныя абходы – спецыфіка велікоднай абраднасці. Этымалогія слова “валачобнікі”, структура і тэндэнцыя развіцця абраду.

*Тэма 13. Сімволіка і семантыка Юр'я – свята выгану жывёлы ў поле*

Катарсічныя абрады і імітацыйная магія старажытнага аграрна-жывёлагадоўчага свята Юр'я. Хрысціянскія наслаенні на народную абраднасць. Юр'еўскія песні. Забаўляльныя (пацяшальныя) элементы абрадаў юр'еўскага цыкла.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 14. Сёмуха. Русальны тыдзень*

Абрады сёмушна-русальнага цыкла і іх агульнаславянскі характар. Генезіс, структура і напрамак абрадаў, рэлігійныя і свецкія напластаванні, трансфармацыя ў працэсе развіцця. Агульнаславянская аснова абрадаў, тэрытарыяльныя абрадавыя комплексы беларусаў, іх структура і аналогія з рускай, украінскай і літоўскай абраднасцю. Генезіс і структура абраду "куст", які з'яўляецца спецыфікай беларускай веснавой абраднасці.

## Раздзел II. Грамадскі і сямейны быт беларусаў

*Тэма 15. Беларускае вяселле*

Беларускі вясельны абрад, яго структура, чыны, звычаі. Рэлігійны абрад вянчання. Асаблівасць сучаснай вясельнай абраднасці Беларусі. Святкаванне сярэбранага і залатога вяселляў.

*Тэма 16. Сямейная абраднасць.*
*Народныя звычаі абраду радзін*

Сям'я як гаспадарчая і сацыяльная адзінка абшчыны. Характэрныя і адметныя рысы вялікай і малой сем'яў. Прававое становішча мужчыны і жанчыны ў вялікай і малой сем'ях, раздзяленне працы з улікам полу. Развіццё таварнай вытворчасці як фактар расслаення сялянства. З'яўленне і распаўсюджванне прымацтва. Традыцыя ранняга далучэння дзяцей да працы. Агульная характарыстыка радзіннай, вясельнай і пахавальна-памінальнай абраднасці. Сучасная сямейная абраднасць. Народныя хрысціянскія абрады радзін.

*Тэма 17. Грамадскія звычаі беларусаў*

Працэс гістарычнага развіцця грамадскага і сямейнага побыту беларусаў. Асноўныя рысы і асаблівасці грамадскага побыту. Абшчына. Грамада і яе функцыянальнае прызначэнне. Грамадскія звычаі: сябрына, вечарына, банда, талака – і іх характарыстыка. Абшчынны характар свят каляндарнага цыкла.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 18. Пахавальна-памінальная абраднасць*

Народныя галашэнні. Рэлігійная пахавальная абраднасць. Структура і характэрныя рысы новых абрадаў пахавання і памінак.

## Раздзел III. Паратэатральная культура Беларусі XIV–XIX стст.

*Тэма 19. Паратэатральнае дзейства беларускай шляхты*

Генезіс паратэатральнага дзейства, яго вытокі і тэндэнцыі развіцця на розных гістарычных этапах. Структура, выразныя сродкі і семантыка хрысціянскіх і свецкіх тэатралізаваных шэсцяў, абрадаў. Адметныя асаблівасці, выразныя сродкі і кампазіцыйная пабудова імянін, дзён нараджэнняў і вяселляў беларускай шляхты. Рытуальныя сустрэчы каранаваных асоб, магнатаў. Тэатралізаваныя паляванні ў беларускіх пушчах.

*Тэма 20. Баявыя і спартыўныя адзінаборствы беларусаў*

Месца адзінаборстваў у святочным жыцці беларускага народа. Паходжанне і тэндэнцыі развіцця спартыўных гульняў. Баявыя практыкаванні і адзінаборствы як спосаб ваеннай падрыхтоўкі. Рыцарскія турніры, іх змест, умовы паядынкаў, мастацка-дэкаратыўнае вырашэнне пляцоўкі. Традыцыі правядзення турніра "Кароль курка" ў Слуцку, Нясвіжы, Быхаве (сярэдзіна XVII–XVIII ст.). Конныя каруселі ў замках і кадэцкіх карпусах Нясвіжа, Слуцка, Шклова, Гродна: мастацкае афармленне, рытуал адкрыцця, гульнявы змест. Кірмашовыя спартыўныя забавы (барацьба з "пераадзетым мядзведзем", абгонкі на "казе", плаванне праз рэчку, бег, змаганне на конях).

## Раздзел IV. Беларуская народная кухня

*Тэма 21. Гісторыя беларускай народнай кухні*

Беларуская народная кухня і яе ўплыў на кухню суседніх раёнаў. Месца зерневых культур у харчовым рацыёне беларусаў. Асноўныя прадукты харчавання беларусаў. Штодзённая ежа. Стравы з зерневых культур, бульбы. Мучныя стра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вы. Прыправы. Мясныя, малочныя, рыбныя стравы. Гароднiна i садавiна. Старадаўнiя напоi беларусаў.

*Тэма 22. Традыцыi народнага застолля. Этыкет паводзiн за сталом*

Парадак харчавання беларусаў. Этыкет паводзiн за сталом. Адметныя асаблiвасцi шляхецкага застолля. Тэатралiзацыя застолля. Масленiчныя кулiгi. Застольны шляхецкi рытуал.

*Тэма 23. Святочныя i абрадавыя стравы каляндарнага цыкла i сямейна-бытавых абрадаў*

Генезiс, сiмволiка i семантыка выкарыстання зерня ў прыгатаваннi куццi. Абрадавыя стравы народных i сямейных свят. Культурна-бытавыя традыцыi народных свят: Каляды, Масленiца, Гуканне вясны, Юр'е, Вялiкдзень, Сёмуха, Купалле, Зажынкi, Дажынкi, Багач. Рэгiянальныя асаблiвасцi рэцэптуры абрадавых i святочных страў.

## Раздзел V. Народныя традыцыi i навацыi ў сучасных беларускiх святах

*Тэма 24. Традыцыi i навацыi ў сучасных зiмовых святах*

Змены ў традыцыйнай зiмовай каляндарнай абраднасцi на сучасным этапе. Уздзеянне сучасных этнiчных працэсаў на святкаванне Каляд ва ўмовах горада. Асаблiвасцi сучасных навагоднiх святкаванняў ва ўмовах горада i вёскi. Агульнанацыянальныя рысы i тэрытарыяльныя асаблiвасцi сучаснага абраду калядавання. Новыя выразныя сродкi святкавання Раства Хрыстова.

*Тэма 25. Выкарыстанне народных традыцый у сучасных святах вясенне-летняга цыкла*

Працэс развiцця веснавой абраднасцi на сучасным этапе i яго асаблiвасцi. Традыцыйнае i новае ў веснавых святах беларусаў. Стандартызацыя афiцыйнай часткi свят i адсутнасць масавага пасляабрадавага дзеяння як вынiк фармальнага падыходу да выкарыстання народных традыцый. Агульная характарыстыка сучаснага купальскага свята на тэрыторыi Беларусi. Страта рэлiгiйных элементаў i развiццё эстэтычных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кампанентаў у абрадах і рытуалах Купалля. Формы ўвасаблення свята, агульнанацыянальныя кампаненты. Тэрытарыяльныя адрозненні вогненных забаў. Дзейнасць культасветустаноў краіны па выкарыстанні народных традыцый у святце летняга сонцастаяння.

*Тэма 26. Традыцыйнае і новае ў сучасных восеньскіх святах*

Новыя формы ўвасаблення свята Дажынкі ва ўмовах горада і вёскі. Кірмаш як унікальная форма арганічнага спалучэння гандлю, відовішчаў і забаў. Свята народных рамёстваў на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Выкарыстанне гандлёвых атракцыёнаў на сучасных кірмашах. Спартыўная праграма ў час святочнага гандлю.

*Тэма 27. Традыцыі і навацыі ў сучасных гарадскіх святах Беларусі*

Генезіс і тэндэнцыя развіцця свят горада ў сучаснай Беларусі. Іх агульнанацыянальныя рысы і тэрытарыяльныя асаблівасці. Вызначэнне мастацка-вобразнага вырашэння свята. Сучасныя прыёмы актывізацыі ўдзельнікаў свята, творчыя знаходкі. Праблемы захавання і развіцця традыцый правядзення свята горада.

*Тэма 28. Традыцыі і навацыі ў сямейна-бытавой абраднасці*

Сучасныя беларускія традыцыі святкавання дня нараджэння, юбілею і дзён імянін. Звычай уваходзін. Сустрэча Новага года. Традыцыйная і новая формы народнай талакі. Структура і характэрныя рысы новых абрадаў пахавання і памінак.

## Раздзел VI. Сучасны святочны каляндар Беларусі

*Тэма 29. Дзяржаўныя святы*

Дзяржаўныя святы – святы, усталяваныя ў азнаменаванне падзей, якія маюць вялікае гістарычнае ці грамадска-палітычнае значэнне для краіны і аказваюць уплыў на развіццё грамадства.

Увядзенне ў каляндар дзяржаўных свят юбілеяў выдатных дзеячаў культуры, навукі, мастацтва, літаратуры. Структура святкавання юбілеяў заснавання беларускіх гарадоў. Дзяржаўная сімволіка ў сучасных абрадах і святах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Структура дзяржаўных свят. Абрадава-рытуальная частка: традыцыі святочнага шэсця, правядзенне мітынгаў і ўскладанне кветак да помнікаў загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны, парад ваеннай тэхнікі, цырымонія ўрачыстага адкрыцця і закрыцця свята, урадавы канцэрт.

Арганізацыя пазаабрадавай часткі свята: правядзенне паказальных і спартыўных выступленняў, выставак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, арганізацыя святочных мерапрыемстваў у мікраараёнах горада, канцэртныя выступленні, водная феерыя, святочны феерверк.

Трансфармацыя зместу, маштабу, эмблематыкі і сімволікі дзяржаўных свят на сучасным этапе. Узбагачэнне і пашырэнне сродкаў святочнай відовішчнасці і афармлення.

*Тэма 30. Міжнародныя святы*

Структура свята. Конкурс – галоўнае мерапрыемства свята. Стварэнне абрадава-рытуальнай часткі свята на аснове народных традыцый. Выкарыстанне выразных сродкаў у міжнародных святах (шэсце, музыка, кіна-, відэаматэрыялы і інш.). Праблема стварэння гульнявога комплексу кожнага канкрэтнага свята.

*Тэма 31. Прафесійныя святы*

Прафесійныя святы работнікаў асобных прафесій, галін гаспадаркі і сфер дзейнасці. Генезіс прафесійных свят. Святы цэхавых рамеснікаў, прысвечаныя святым патронам асобных карпарацый (Кузьма і Дзям'ян – апекуны кавалёў; Пётр і Павел – рыбаловаў; Параскева (Пятніца) – жаночых рамёстваў), – найбольш старажытная форма прафесійных свят у Беларусі і іх структура.

Формы правядзення прафесійных свят. Абрадава-рытуальная і пазаабрадавая часткі свят Узброеных Сіл РБ на сучасным этапе: рытуальная частка (ускладанне кветак да помнікаў загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны, парад ваеннай тэхнікі, правядзенне паказальных і спартыўных выступленняў); цырыманіяльная частка (вынас сцягоў дзяржаўнай сімволікі і сімволікі УС РБ, пачэсныя каравулы); пазаабрадавая частка сустрэч з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, агляд-конкурс ваенных духавых аркестраў, правядзенне тэматычных канцэртаў, святочны салют.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 32. Рэлігійныя святы*

Праваслаўныя святы, дні праслаўлення падзей ці персаналій, якія з'яўляюцца найбольш значнымі для праваслаўнай царквы. Генезіс хрысціянскіх свят.

Змест і вобразнае ўвасабленне рэлігійных абрадаў: хрышчэнне, мірапамазанне, прычасце, споведзь. Перапляценне язычніцкіх і хрысціянскіх элементаў у рэлігійных абрадах. Класіфікацыя праваслаўных свят: па часе – рухомыя і нерухомыя; па змесце – у гонар Хрыста, Багародзіцы і святых; па значнасці – вялікія, сярэднія, малыя.

Форма правядзення праваслаўных свят: хрэсны ход вакол храма і ўрачыстае богаслужэнне, прысвечанае пэўнай падзеі ці пэўнай асобе, святочная літургія.

Спецыфіка пасхальнай абраднасці.

Увядзенне некаторых праваслаўных свят у ранг дзяржаўных. Свецкія напластаванні і праваслаўныя святы. Сістэма пастоў у праваслаўным і каталіцкім календарах беларусаў.

Каталіцкія святы. Касцельныя абрады і святы як рэлігійныя цырымоніі набажэнства. Урачыстыя (галоўныя) і неўрачыстыя (другасныя) святы.

Форма правядзення каталіцкіх абрадаў і касцельных цырымоній.

Традыцыі фэстаў (храмавых свят) і кірмашоў, прымеркаваных да свят каталіцкага календара.

*Тэма 33. Маладзёжныя і дзіцячыя святы*

Тэатралізаваныя маладзёжныя і дзіцячыя святы, іх эмацыянальна-вобразнае ўздзеянне на асобу (Дзень абароны дзяцей, Дзень моладзі, свята дзіцячай лялькі і цацкі). Выхаваўчы патэнцыял новых маладзёжных традыцый, абрадаў і свят (інаўгурацыя навучальнага года, баль выпускнікоў, праграмы экалагічнай накіраванасці). Формы і метады актывізацыі ўдзельнікаў свята і іх далучэння да яго правядзення. Структура конкурсаў і фестываляў дзіцячага мастацтва. Арганізацыя тэатралізаванага дзеяння на аснове гульнявых сітуацый. Дыферэнцыраваны ўзроставы падыход да мастацка-вобразнага і музычнага афармлення свят.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*

*Барташэвіч, Г. А.* Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя / Г. А. Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – С. 54–197.

*Беларускія* народныя абрады / склад., навук. рэд. і прадм. Л. П. Касцюкавец. – Мінск: Беларусь, 1994. – С. 1–128.

*Беларусы*. Грамадскія традыцыі / В.Ф.Бацяеў [і інш.]; рэдкал.: В.М.Бялявіна [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – Т. 6. – С. 467–606.

*Беларусы*. Славянскія этнакультурныя традыцыі / І. У. Чаквін [і інш.]; рэдкал.: І. У. Чаквін [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – С. 321–514.

*Грамадскі* быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі / В.К.Бандарчык [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – Т. 10. – С. 123–248.

*Грамадскі* быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 34–253.

*Гуд, П. А.* Беларускае Купалле: кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей / П. А.Гуд. – Мінск: БДУ культуры, 1999. – С. 5–137.

*Гуд, П. А.* Беларускі кірмаш / П. А. Гуд, Н. І. Гуд. – Мінск: Полымя, 1996. – С. 200–270.

*Гурскі, А. І.* Святкаванне Каляд на Беларусі / А. І. Гурскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – С. 17–94.

*Дай* Божа знаць, з кім век векаваць: беларуская народная варажба / склад. У.А.Васілевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 3–63.

*Земляробчы* каляндар. Абрады і звычаі / уклад., класіфікацыя, сістэматызацыя матэрыялаў і камент. А.І.Гурскага; уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса. – 2-е выд., выпр. – Мінск: Беларус. навука, 2003. – С. 45–429.

*Каляндарна*-абрадавая паэзія / А. С. Ліс, А. І. Гурскі, В. М. Шарая, У. М. Савіцкі; навук. рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – С. 345–515.

*Камінскі, А. Я.* Зімовыя святы / А. Я. Камінскі. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2010. – С. 3–143.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Камінскі, А. Я.* Рэжысура традыцыйнага абраду / А. Я. Камінскі. – Мінск: БДУ культуры і мастацтваў, 2009. – С. 10–113.

*Карскі, Я.* Беларусы / Я. Карскі; уклад. і камент. С. Гараніна і Л. Ляўшун; навук. рэд. А. Мальдзіс. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2001. – С. 234–640.

*Катовіч, А.* Веснавыя святы: нарысы: у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук. – Мінск: Маст. літ., 2005. – Кн. 1. – С. 300–359.

*Катовіч, А.* Зімовыя святы: нарысы / А. Катовіч, Я. Крук. – Мінск: Маст. літ., 2004. – С. 15–119.

*Крук, І. І.* Сімволіка беларускай народнай культуры / І. І. Крук. – Мінск: Беларусь, 2003. – С. 3–350.

*Крук, Я.* Следам за сонцам: Беларускі народны каляндар / Я. Крук. – Мінск: Беларусь, 1998. – С. 16–216.

*Кухаронак, Т. І.* Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск: Ураджай, 2001. – С. 3–105.

*Кухаронак, Т.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: канец XIX–XX ст. / Т. Кухаронак. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 56–126.

*Ліс, А. С.* Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў: сістэма жанраў. Эстэтычны аспект / А. С. Ліс. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – С. 76–188.

*Мальдзіс, А.* Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII ст.: нарысы быту і звычаяў / А. Мальдзіс. – Мінск: Беларус. навука, 1982. – С. 56–276.

*Радзіны.* Абрад. Песні / рэдкал.: А. С. Фядосік [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – С. 3–56.

*Тавлай, Г. В.* Белорусское купалье: обряд, песня / Г. В. Тавлай. – Минск: Наука и техника, 1986. – С. 3–74.

*Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева [і інш.]; склад. Т. Б. Варфаламеева. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне. – С. 17–56.

*Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / В. І. Басько [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 2006. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне. – С. 19–105.

*Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – Т. 1: Магілёўскае Падняпроўе. – С. 17–90.

*Фядотаў, А. Г.* Канфесійныя цырымоніі і святы беларускага горада XVII–XVIII стагоддзяў / А. Г. Фядотаў // Вестник

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

молодежного научного общества. – Минск: Молодежное научное общество, 2003. – С. 100–106.

*Фядотаў, А. Г.* Свята беларускага пісьменства ў школе / А. Г. Фядотаў. – Мінск: Беларус. навука, 2000. – С. 3–56.

*Дадатковая*

*Камінскі, А. Я.* Святочная культура беларусаў у пачатку XX ст. Зімовыя святы / А. Я. Камінскі // Мова – літаратура – культура: матэрыялы III Міжнар. навук. канф. – Мінск: БДУ, 2002. – С. 270–280.

*Камінскі, А. Я.* Традыцыйная святочная культура Усходняга Палесся. Лакальныя асаблівасці / А. Я. Камінскі // Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся: матэрыялы Міжнар. навук. канф. – Гомель: ГДУ, 2004. – Ч. 1. – С. 268–272.

*Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. Беларуская этнаграфія ў доследах і матэрыялах / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск: Беларус. акад. навук, 1930. – С. 234–383.

*Сям'я* і сямейны быт беларусаў / рэдкал.: В. М. Бялявіна [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 2002. – С. 234–345.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ТРАДЫЦЫЙНАЯ**
**СВЯТОЧНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСАЎ**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01*
*Рэжысура свят (народныя)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 1,26. Ул.-выд. арк. 0,77.
Тыраж экз. Заказ .

УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0003939 ад 19.05.2011 г.

Надрукавана на рызографе
УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ